# ФАРМІРАВАННЕ КАДРАВАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ ПРАМЫСЛОВАСЦІ БССР: СІСТЭМА ЭКАНАМІЧНАЙ АДУКАЦЫІ ПРАЦОЎНЫХ У 1970–1980-я гг.

***І. А. Пушкін***
*дацэнт кафедры гуманітарных дысцыплін установы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання»,*
*дактарант Інстытута гісторыі НАН Беларусі*

У пачатку 1970-х гадоў пастановаю ЦК КПСС «Об улучшении экономического образования трудящихся» была пастаўлена задача забяспечыць высокі ўзровень эканамічнай адукацыі: а) кіруючых кадраў і спецыялістаў народнай гаспадаркі ў вобласці марксісцка-ленінскай эканамічнай тэорыі і эканамічнай палітыкі партыі, практыцы кіравання вытворчасцю, удасканалення метадаў выхавання і арганізацыі людзей; б) рабочых, служачых і калгаснікаў — па пытаннях эканамічнай палітыкі партыі, асновах эканамічных ведаў, навуковай арганізацыі працы і вытворчасці, практыцы эканамічнай дзейнасці прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў. Для выканання гэтай пастановы ў Магілёўскай вобласці былі створаны 169 тэарэтычных семінараў, 338 школ камуністычнай працы. Вялікая роля адводзілася вывучэнню эканомікі ў «ленінскіх народных» школах і народных універсітэтах [1, арк. 198–199].

Планавалася ў 1972/1973 навучальным годзе без адрыву ад вытворчасці абучыць усіх работнікаў апарата кіравання, дырэктараў і галоўных інжынераў прадпрыемстваў, 30–40 % кіраўнікоў сярэдняга звяна і спецыялістаў, 20–25 % рабочых. У наступным навучальным годзе — 40–45 % кіраўнікоў сярэдняга звяна, 30–40 % рабочых; у 1974/1975 навучальным годзе — 30–35 % спецыялістаў і 40–45 % рабочых. Такім чынам, збіраліся завяршыць абучэнне ўсіх катэгорый працуючых да 1976 года.

Склад выкладчыкаў (лектараў), формы і тэрміны абучэння ўзгадняліся з мясцовымі партыйнымі органамі. Галоўнымі тэмамі былі пытанні эканамічнай палітыкі кіруючай камуністычнай партыі, асновы эканамічных ведаў і навуковай арганізацыі працы і вытворчасці, практыка эканамічнай дзейнасці прадпрыемства. Дырэктары і галоўныя інжынеры прадпрыемстваў навучаліся з адрывам ад вытворчасці на 2-месячных курсах кіравання народнай гаспадаркай у Беларускім дзяржаўным інстытуце народнай гаспадаркі імя В. Куйбышава. Накіраванне на курсы праводзілася ў парадку і на ўмовах, якія былі прадугледжаны пастановаю

СМ СССР ад 6.06.1967 г. № 515 і адпаведнай пастановай СМ БССР ад 20.07.1967 г. № 242 [2, арк. 126, 127].

ЦК КПСС абавязаў міністэрствы і ведамствы прыняць меры па далейшым павышэнні якасці эканамічнай падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў у ВНУ, тэхнікумах, ПТВ, інстытутах, на факультэтах і курсах павышэння кадраў. Эканамічная адукацыя розных катэгорый работнікаў без адрыву ад вытворчасці праводзілася праз школы камуністычнай працы, народныя ўніверсітэты і эканамічныя двухгадовыя школы на прадпрыемствах.

Варта прывесці змест тыповых планаў і праграм па эканамічнай вучобе: а) «Навука і практыка кіравання» (120 гадз) — для кіруючых кадраў міністэрстваў і цэнтральных ведамстваў; б) «Асновы навуковага кіравання сацыялістычнай вытворчасцю» (120 гадз) — для кіраўнікоў прадпрыемстваaў і аб’яднанняў прамысловасці і іншых галін; в) «Асновы навуковага кіравання сельскагаспадарчай вытворчасцю» (120 гадз) — для дырэктараў саўгасаў, старшынь калгасаў і галоўных спецыялістаў гаспадарак; г) «Асновы эканомікі і кіравання вытворчасцю» (90 гадз) — для сярэдняга звяна кіравання і спецыялістаў на прадпрыемствах прамысловасці і іншых галін; д) «Асновы эканомікі і кіравання сельскагаспадарчай вытворчасцю» (90 гадз) — для сярэдняга звяна кіравання ў калгасах і саўгасах; е) «Асновы эканамічных ведаў» (60 гадз) — для рабочых і калгаснікаў, якія вучыліся ў двухгадовых эканамічных школах, у школах камуністычнай працы; ж) «Асновы эканомікі працы і вытворчасці» (30 гадз) — для эканамічнай падрыхтоўкі рабочых і калгаснікаў у сістэме прафтэхадукацыі і на курсах пры прадпрыемствах [3, арк. 132].

Назіралася імкненне надаць эканамічнай адукацыі стройную сістэму абучэння кадраў, складаліся перспектыўныя планы на 1972–1975 гады. Падбіраліся прапагандысты (лектары) для сістэмы эканамічнай адукацыі з ліку эканамістаў, галоўных спецыялістаў і кіраўнікоў прадпрыемстваў, планавалася забеспячэнне павышэння іх эканамічнай і метадычнай падрыхтоўкі на спецыяльных курсах і семінарах. Эканамічную падрыхтоўку разглядалі як абавязковы бок кваліфікацыі кожнага работніка. Праводзіліся агляды-конкурсы на лепшую пастаноўку эканамічнай вучобы на прадпрыемствах, калгасах і саўгасах. Праводзілі тэарэтычныя і навукова-практычныя канферэнцыі па пытаннях навукова-тэхнічнага прагрэсу, эфектыўнасці вытворчасці, навуковай арганізацыі працы і кіравання. Была створана, прынамсі на паперы, сетка пастаянна дзеючых эканамічных лекторыяў на прадпрыемствах [4, арк. 165–166].

Кіраўніцтва эканамічнай адукацыяй было даручана партыйным органам. Пры абласных, гарадскіх і раённых камітэтах (АК, ГК і РК)

камуністычнай партыі Беларусі (КПБ) ствараліся саветы па эканамічнай адукацыі, на прадпрыемствах былі распрацаваны планы эканамічнай вучобы. Планавалася ахапіць эканамічнай адукацыяй усіх работнікаў [3, арк. 131]. Напрыклад, у Віцебскай вобласці было ахоплена эканамічнай вучобай амаль 127 тыс. чал., у тым ліку 34 тыс. у двухгадовых эканамічных школах і 24,7 тыс. у школах камуністычнай працы [5, арк. 46]. Але з самага пачатку існавалі істотныя недахопы ў падрыхтоўцы і правядзенні эканамічнай адукацыі кіруючага складу, інжынерна-тэхнічных работнікаў (ІТР), рабочых і служачых [2, арк. 125–128]. Марудна пераглядаліся планы і праграмы павышэння кваліфікацыі працоўных з мэтаю ўключэння ў іх тэм па эканамічных пытаннях і якія мелі дачыненне да пэўнага прадпрыемства, не было падбору адпаведных лектараў, не паўсюль вызначана форма навучання для работнікаў апарата. У школах партыйна-гаспадарчага актыву асобныя заняткі праводзіліся на нізкім тэарэтычным узроўні. Вельмі рэдка выступалі перад калектывамі з лекцыямі і дакладамі кіраўнікі заводаў і прадпрыемстваў. Многія слухачы школы сістэматычна не наведвалі заняткаў [6, арк. 27].

На пасяджэнні бюро Магілёўскага АК КПБ 26 мая 1972 года разглядалася пытанне «Аб стане эканамічнай вучобы кадраў на прадпрыемствах прамысловасці, будаўніцтва, транспарту, гандлю, у калгасах і саўгасах Крычаўскага раёна». Заслухаўшы справаздачу першага сакратара Крычаўскага райкама КПБ аб стане эканамічнай вучобы кадраў у раёне, бюро Магілёўскага абкама КПБ адзначыла, што на прадпрыемствах прамысловасці, транспарту, будаўніцтва і гандлю раёна была праведзена пэўная праца па выкананні пастановы ЦК КПСС «Аб паляпшэнні эканамічнай адукацыі працоўных». У сістэме партыйнай адукацыі і камсамольскай палітасветы пытанні эканамічнай палітыкі КПСС, ленінскія прынцыпы гаспадарання вывучалі каля тысячы чалавек, або 30 % складу слухачоў. У 1972 годзе ў Крычаўскім раёне працавалі два ўніверсітэты тэхніка-эканамічных ведаў, універсітэт сельскагаспадарчых ведаў пры ўпраўленні сельскай гаспадаркі з філіяламі ў калгасах і саўгасах, 12 школ камуністычнай працы, якімі было ахоплена больш за тры тысячы чалавек. На некаторых прадпрыемствах (завод гумовых вырабаў, чыгуначная станцыя «Крычаў» і інш.) працавалі школы перадавога вопыту, курсы тэхнічнага ўсенавуча. На цэмента-шыферным камбінаце эканамічнай вучобай ахапілі звыш 400 чалавек, або 20 % агульнага складу працуючых. Аднак у шэрагу выпадкаў прапаганда эканамічных ведаў вялася на нізкім тэарэтычным узроўні, у адрыве ад задач, што вырашаліся вытворчымі калектывамі. На некаторых прадпрыемствах транспарту, будаўніцтва і

гандлю (аўтакалона 2441, аўтабаза трэста «Крычаўсельбуд», БУ-62, гарпрамгандль) эканамічнай вучобы практычна не было [4, арк. 163–166].

Некаторыя кіруючыя работнікі, дырэктары прадпрыемстваў Крычаўскага раёну ўхіляліся ад прапаганды эканамічнай тэорыі, не працавалі над павышэннем сваіх эканамічных ведаў. Усё гэта адмоўна адбівалася на іх дзейнасці па кіраўніцтву гаспадаркамі і прадпрыемствамі. У раёне пытанні эканамічнай вучобы не знаходзілі належнага адлюстравання ва ўмовах сацыялістычнага спаборніцтва, у калектыўных дагаворах, планах сацыяльнага развіцця. Не ўлічвалася ступень эканамічнай падрыхтоўкі пры павышэнні разрадаў і класнасці, прысваенні ганаровых званняў. Створаныя ў гаспадарках саветы і бюро эканамічнага аналізу ў шэрагу выпадкаў існавалі фармальна, не выконвалі сваіх абавязкаў. Нездавальняюча распаўсюджваліся ў раёне эканамічныя выданні. Большасць спецыялістаў сельскай гаспадаркі, транспарту, гандлю не выпісвалі газеты і часопісы. Кабінет палітычнай асветы Крычаўскага райкама КПБ не аказваў належнай дапамогі прапагандыстам у атрыманні эканамічнай інфармацыі (падобнае было ва ўсіх раёнах БССР). У кабінеце не было выставы эканамічнай літаратуры, не вялася картатэка газетна-часопісных артыкулаў, прысвечаных папулярызацыі эканамічнай тэорыі, эканамічнай палітыкі КПСС. Адсутнічалі матэрыялы па развіцці раёна. Пытанні прапаганды эканамічных ведаў, станоўчага вопыту работы эканамічных школ і семінараў, універсітэтаў тэхніка-эканамічных і сельскагаспадарчых ведаў, школ камуністычнай працы слаба асвятляліся на старонках раённай газеты.

Наогул у БССР райкамы КПБ, першасныя партыйныя аддзелы не надавалі належнага значэння павышэнню якасці і дзейснасці эканамічнай вучобы, часцяком не вызначалі прапагандыстаў (лектараў), не распрацоўвалі мерапрыемствы па іх метадычнай і спецыяльнай падрыхтоўцы, не прымалі належных мер да стварэння матэрыяльнай базы для ўсіх формаў эканамічнай адукацыі. Сур'ёзныя недахопы ў арганізацыі эканамічнай адукацыі працоўных з'яўляліся следствам слабай патрабавальнасці з боку райкамаў КПБ да кіраўнікоў прадпрыемстваў і іх адказнасці за стан эканамічнай адукацыі ў калектывах працоўных, якімі яны кіравалі, адсутнасці кантролю з боку першасных партыйных арганізацый за правядзенне эканамічнай вучобы кадраў [4, арк. 165]. Выкарыстоўваўся толькі адміністратыўны рэсурс.

У 1978/1979 навучальным годзе ў Магілёўскай вобласці да заняткаў партыйнай вучобы, камсамольскай палітасветы і эканамічнай адукацыі далучылі 245 тыс. слухачоў. У некаторых эканамічных школах Слаўгарадскага, Чэрыкаўскага, Крычаўскага раёнаў на занятках выступалі

кіраўнікі прадпрыемстваў і гаспадарак, абмяркоўваліся шляхі павышэння эфектыўнасці вытворчасці, ход выканання планаў і сацыялістычных абавязкаў, выпрацоўвалася калектыўная думка па выкарыстоўванні рэзерву кадраў на вытворчасці і пазбаўленні недахопаў у працы. У той жа час не праводзіліся заняткі ў шэрагу эканамічных школ Краснапольскага, Шклоўскага, Крычаўскага раёнаў, праводзіліся на нізкім метадычным і тэарэтычным узроўні ў Бабруйскім, Магілёўскім, Кіраўскім і Круглянскім раёнах [7, арк. 99–103].

У БССР дзейнічалі абласныя метадычныя саветы вытворча-эканамічнай адукацыі і прафесійнага навучання. 25 мая 1973 года на пасяджэнні бюро Гомельскага АК КПБ разглядалася пытанне «Аб арганізацыі абласнога грамадскага савета па эканамічнай адукацыі працоўных» [8, арк. 19–20]. Савет быў створаны ў складзе 23 асоб (старшыня савета — сакратар АК КПБ). У яго ўваходзілі: два сакратары АК КПБ, загадчык аддзела АК КПБ, выкладчыкі Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта, сакратары ГК і РК КПБ, начальнік упраўлення культуры, намеснік рэдактара газеты і інш. Савет павінен быў выконваць наступныя функцыі: а) каардынацыя дзейнасці абласных гаспадарчых ведамстваў і арганізацый, прафсаюзных і іншых грамадскіх арганізацый па выкананні пастановы ЦК КПСС «Аб паляпшэнні эканамічнай адукацыі працоўных»; б) вывучэнне стану эканамічнай вучобы кадраў, прыняцце рэкамендацый па яе далейшым паляпшэнні; в) абагульненне вопыту працы па эканамічнай адукацыі; г) кіраўніцтва метадычнымі саветамі па эканамічнай адукацыі пры РК і ГК КПБ; д) кантроль за выкананнем перспектыўнага плана эканамічнай адукацыі працоўных; е) заслухоўванне справаздач абласных упраўленняў, ведамстваў, прадпрыемстваў, саветаў па эканамічнай адукацыі пры РК і ГК КПБ і прыняцце адпаведных рэкамендацый; ж) штогадовае падвядзенне вынікаў па эканамічнай адукацыі працоўных [9, арк. 43].

У другой палове 1980-х гадоў пры міністэрствах БССР ствараліся саветы па эканамічнай адукацыі працоўных і прафесійнаму абучэнню кадраў на вытворчасці і ўзначальвалі іх, як правіла, намеснікі міністраў [10, арк. 90].

У абласцях з сакавіка 1986 года метадычныя саветы па эканамічнай вучобе пераўтварыліся ў саветы па эканамічнай адукацыі працоўных і прафесійным навучанні кадраў. Так, напрыклад, восенню 1985 года такі быў створаны пры ўпраўленні мясцовай прамысловасці Віцебскай вобласці. На пасяджэнні савета, які дзейнічаў пры ўпраўленні мясцовай прамысловасці Віцебскага аблвыканкама, 4 мая 1989 г. было адзна-

чана, што пэўная работа па эканамічным «ўсенавучы» праводзілася на: Віцебскім ВА «Хімпласт», ВШВА «Віцебчанка», Віцебскім ВАБМ «Будаўнік», Віцебскім тэкстыльным ВА, Віцебскім ВАНТ і інш., але нездавальняюча праводзілася праца ў Варапаеўскім ДАК, Аршанскім і Докшыцкім КСМ [11, арк. 83].

У 1985/1986 навучальным годзе на прадпрыемствах мясцовай прамысловасці Віцебскай вобласці былі створаны і павінны былі распачаць працу з 1 кастрычніка 88 школ камуністычнай працы, 18 школ «канкрэтнай эканомікі». У іх павінны былі вывучацца наступныя курсы: 1) «Рэзервы эканоміі і ашчаднасць у дзеянні» — 73 школы, 1 529 слухачоў (адбылося масавае запісванне ўсіх работнікаў — «усенавуч» прыводзіў да фармалізму і зводзіў на нуль усе намаганні); 2) «Працоўны калектыў: кіраванне, дысцыпліна, выхаванне» — 13 школ, 322 слухача; 3) «Інтэнсіфікацыя вытворчасці» — 2 школы, 59 слухачоў. У школах канкрэтнай эканомікі: 1) «Ад эксперымента да новай сістэмы гаспадарання» — 17 школ, 320 слухачоў; 2) «Інтэсіфікацыя вытворчасці» — 1 школа, 20 слухачоў [12, арк. 1–2]. У наступным навучальным годзе планавалася дзейнасць 89 школ камуністычнай працы і 89 школ канкрэтнай эканомікі. Усяго было запісана 2 379 слухачоў. У школах камуністычнай працы — курсы: «Інтэнсіфікацыя вытворчасці» (для рабочых) — 85 школ, 2 287 рабочых; 2) «Інтэнсіфікацыя вытворчасці» (ІТР, кіраўнікі) — 1 школа, 30 чал.; 3) «Паскарэнне НТП — аснова інтэнсіўнага развіцця эканомікі» — 3 школы, 62 чал. [13, арк. 10].

Па выніках 1986/1987 навучальнага года на 13 прадпрыемствах мясцовай прамысловасці Віцебскай вобласці эканамічнай вучобай было ахоплена 30,2 % работнікаў — 2389 слухачоў у 89 школах. Вывучаліся курсы: «Інтэнсіфікацыя вытворчасці» (для рабочых) — 85 школ, 2 297 рабочых; 2) «Інтэнсіфікацыя вытворчасці» (ІТР, кіраўнікі) — 1 школа, 30 чал.; 3) «Паскарэнне НТП — аснова інтэнсіўнага развіцця эканомікі» — 3 школы, 62 чал.; народныя ўніверсітэты — 2 [14, арк. 91].

У сярэдзіне 1980-х гадоў сістэма эканамічнай адукацыі была дрэнна (нездавальняюча) забяспечана вучэбнымі і нагляднымі дапаможнікамі, метадычнымі і нарматыўнымі дакументамі. Абучэнне вялося ў адрыве ад канкрэтных задач, якія вырашаліся калектывамі, асобныя кіраўнікі прадпрыемстваў (аб’яднанняў) не бывалі на занятках, ухіляліся ад арганізацыі эканамічнай падрыхтоўкі [15, арк. 1]. Пераход на новыя метады гаспадарання, узмацненне эканамічных рычагоў кіравання, укараненне гаспадарчага разліку і самафінансавання запатрабавалі новых падыходаў да арганізацыі эканамічнай адукацыі працоўных, павышэння кваліфікацыі кадраў.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што ў 1970–1980-я гады назіралася імкненне надаць эканамічнай адукацыі працоўных стройную сістэму абучэння кадраў. Сістэму эканамічнай адукацыі спрабавалі пабудаваць дыферэнцыравана, з улікам спецыфікі прадпрыемстваў, галін народнай гаспадаркі, характару працы розных катэгорый работнікаў; імкнуліся пры камплектаванні эканамічных школ і семінараў улічваць узровень эканамічнай падрыхтоўкі работнікаў. Кіраўніцтва эканамічнай адукацыяй было даручана партыйным органам, якія дзейнічалі, абапіраючыся толькі на адміністратыўны рэсурс. Менавіта таму з самага пачатку існавалі істотныя недахопы ў падрыхтоўцы і правядзенні эканамічнай адукацыі кіруючага складу, інжынерна-тэхнічных работнікаў, рабочых і служачых — фармалізм, існаванне толькі на паперы (у справаздачах), добраахвотнапрымусовы ўдзел і іншае, што не давала належнага эфекту і дасягнення запланаваных вынікаў у павышэнні кваліфікацыі працоўных БССР.

## Спіс асноўных крыніц

1. Протокол № 8 пленума Могилевского обкома КПБ от 04.07.1972 г. // Дзяржаўны архіў грамадскіх аб’яднанняў Магілёўскай вобласці (ДАГАМАг). – Ф. 9. Воп. 149. Спр. 3.

2. О дополнительных мерах по подготовке к 1972/1973 уч. году в системе экономического образования на предприятиях и в организациях Минместпрома БССР : Приказ № 85 от 27.03.1972 г. Министерства местной промышленности БССР // Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці (ДАМаг). – Ф. 2827. Воп. 1. Спр. 526.

3. Рекомендации по подготовке к 1972/1973 уч. году в системе экономического образования // Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці (ДАМаг). – Ф. 2827. Воп. 1. Спр. 526.

4. Протокол № 33 заседания бюро Могилевского обкома КПБ от 26.05.1972 г. // Дзяржаўны архіў грамадскіх аб’яднанняў Магілёўскай вобласці (ДАГАМАг).– Ф. 9. Воп. 149. Спр. 15.

5. Протокол XI пленума Витебского ОК КПБ 28–29.11.1972 г. // Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВц). – Ф. 1-п. Воп. 124. Спр. 8.

6. Протокол № 31 заседания бюро Могилевского обкома КПБ от 29.04.1972 г. // Дзяржаўны архіў грамадскіх аб’яднанняў Магілёўскай вобласці (ДАГАМАг). – Ф. 9. Воп. 149. Спр. 15.

7. Записка отдела пропаганды и агитации Могилевского обкома КПБ о мерах по выполнению постановления ЦК КПСС «Об итогах 1977/1978 уч. года и очередных задачах системы политического и экономического образования» // Дзяржаўны архіў грамадскіх аб’яднанняў Магілёўскай вобласці (ДАГАМАг). – Ф. 9. Воп. 159. Спр. 141.

8. Пратакол пасяджэння бюро Гомельскага АК КПБ // Дзяржаўны архіў грамадскіх аб’яднанняў Гомельскай вобласці (ДАГАГом). – Ф. 144. Воп. 140. Спр. 11.

9. Пратакол XIX Гомельскай абласной партыйнай канферэнцыі (1975) // Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці (ДАГАГом). – Ф. 144. Воп. 144. Спр. 1.

10. Письмо № 06/л-24 от 20.06.1987 г. // Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці // Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВц). – Ф. 2856. Воп. 7. Спр. 54.

11. Протокол № 2 заседания методического совета производственно-экономического образования и профессионального обучения кадров на производстве управления местной промышленности Витебского облисполкома от 4.05.1989 г. // Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВц). – Ф. 2856. Воп. 7. Спр. 194.

12. Протокол № 1 заседания методического совета по экономическому образованию управления местной промышленности Витебского облисполкома от 30.10.1985 г. // Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВц). – Ф. 2856. Воп. 7. Спр. 54.

13. Протокол № 3 заседания методического совета по экономическому образованию трудящихся и профессиональному обучению кадров управления местной промышленности Витебского облисполкома от 30.10.1986 г. // Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВц). – Ф. 2856. Воп. 7. Спр. 54.

14. Информация об итогах 1986/1987 уч. года в системе экономического образования по управлению Витебского облместпрома. 10.06.1987 г. // Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВц). – Ф. 2856. Воп. 7. Спр. 54.

15. О перестройке системы политической и экономической учебы трудящихся» коллективами предприятий (объединений) управления местной промышленности Витебского облисполкома (1988 г.) : Отчет-информация о выполнении постановления ЦК КПСС от 15.09.1987 г. // Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВц). – Ф. 2856. Воп. 7. Спр. 194.

## ОСОБЕННОСТИ И ПРОБЛЕМЫ ИНФОРМАЦИОННО-РАЗЪЯСНИТЕЛЬНОЙ РАБОТЫ В УСЛОВИЯХ ИНФОРМАЦИОННОЙ ЦИВИЛИЗАЦИИ

***В. Л. Рожковский***

*доцент кафедры социально-гуманитарных дисциплин учреждения образования «Могилевский институт Министерства внутренних дел Республики Беларусь»*

Эпоха трансформаций, становление постмодерна — не лучшие времена для устоявшихся представлений о информационно-разъяснительной работе, представлений, уместных в достаточно статичном мире, в котором, с одной стороны, устойчивая социальная реальность, с дру-